# Сайт Nastaunik.info

## як метад грамадзянскай адукацыі педагогаў

Сярод праблем, з якімі сутыкаюцца адукацыйныя грамадскія арганізацыі Беларусі, бадай асноўнай можна лічыць цяжкасць выхаду на шырокія колы грамадства. Адукацыйныя арганізацыі стаміліся ад бясконцых забарон, пошуку памяшканняў для сваіх мерапрыемстваў, звышкантролю з боку розных дзяржструктур і іншых перашкодаў. Бывае, што на саму статутную дзейнасць — грамадзянскую адукацыю — проста не застаецца сіл.

Дзяржаўная адукацыйная сістэма, прамая функцыя якой займацца фармаваннем грамадзян, таксама ігнаруе свой абавязак, замяніўшы грамадзянскую адукацыю дзяржаўнай ідэалогіяй, мэта якой — прапаганда існуючага рэжыму. Калі надалей такая сітуацыя захаваецца, стануць нормай патэрналізм, ксенафобія, канфармізм, ізаляцыянізм.

Без грамадзянскай адукацыі мы рызыкуем вырасціць новае пакаленне інфантыльных канфармістаў і цынікаў, мы губляем новае пакаленне моладзі, а разам з ім аддаляем дэмакратычную перспектыву для краіны. Усё цяжэй растлумачыць моладзі, што такое дэмакратычныя каштоўнасці. **Гэта для яе — абстрактныя паняцці.** Як немагчыма распавесці чалавеку, якая смачная ежа, якую ён ніколі не каштаваў, так і моладзь, якая сфармавалася пры антыдэмакратычнай уладзе, не адчувае, што такое свабода, выбар, павага да іншай думкі. А калі яна гэтага не прымае, не ведае, то ёй цяжка зразумець за што весці барацьбу.

Вінаваціць грамадскія арганізацыі ў адсутнасці грамадзянскай мужнасці быць прысутнымі ў патрэбным месцы ў патрэбны час не заўсёды выпадае. Апошнім часам трапляюць пад пераслед не толькі самі арганізацыі і іх сябры, да чаго ўжо ўсе мы прывычаіліся, а пераследуюцца ўдзельнікі адукацыйных мерапрыемстваў — звычайныя людзі, з якімі і дзеля якіх мы працуем.

Паўстае задача пошуку новых формаў зносінаў з мэтавымі групамі. Эфектыўных і адносна бяспечных ва ўмовах сучаснай Беларусі. Адным з такіх метадаў працы можа быць арганізацыя віртуальнай камунікацыі праз Інтэрнет — адзіную пакуль яшчэ свабодную прастору для распаўсюду інфармацыі ў Беларусі.

У гэтым артыкуле мы хочам падзяліцца досведам Цэнтра Супольнасць, які паспрабаваў арганізаваць дыстанцыйную камунікацыю з настаўнікамі з дапамогай Інтэрнету і далучыў да стварэння прафесійнай web-пляцоўкі саміх настаўнікаў.

### Гісторыя стварэння

Каб навучыцца і зрабіць старонку ў Інтэрнеце, чалавеку, які валодае камп'ютэрам на ўзроўні карыстальніка, патрэбна паўгадзіны (праверана на 56 настаўніках). Але стварыць сайт, які выконвае функцыі метадычнага дапаможніка, інфармацыйнага рэсурса і своеасаблівай пляцоўкі для зносінаў паміж прафесіяналамі, ды яшчэ мае звышмэту — вучыць дэмакратыі ва ўмовах, калі веды пра дэмакратыю незапатрабаваныя ў грамадстве, бо дзяржава абмежавала сферы, дзе гэтыя веды прыдаліся б на практыцы — вельмі цяжкая задача.



Ідэя стварэння спецыялізаванага сайта для настаўнікаў узнікла ў Цэнтра Супольнасць пасля 6 год працы з педагогамі, якія зацікаўленыя ў дэмакратызацыі адукацыйнага працэсу. Сайт **Nastaunik.info** — гэта своеасаблівае перанясенне ў Інтэрнет-прастору адукацыйнага досведу праграмы "Настаўнік. Школа. Грамадства", які назапасілі за час існавання праграмы яе ўдзельнікі — педагогі з усіх рэгіёнаў краіны. Таму напачатку некалькі слоў пра саму праграму.

Праца ў межах праграмы "Настаўнік. Школа. Грамадства" пачалася ў 1999 годзе з апытання патрэбаў педагогаў, якія імкнуліся да ўдасканалення сваёй прафесійнай дзейнасці і ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці: вялі гурткі, працавалі з калегамі і бацькамі, выдавалі школьныя газеты і бюлетэні, выступалі з адукацыйнымі, экалагічнымі, сацыяльнымі ініцыятывамі. Выявіліся патрэбы ў інфармацыйнай і метадычнай падтрымцы іх дзейнасці. Так узнікла праграма "Настаўнік. Школа. Грамадства" — праграма метадычнай і грамадзянскай адукацыі настаўнікаў.

Да Цэнтра Супольнасць далучыўся шэраг грамадскіх арганізацый адукацыйнага кірунку сярод якіх "Таварыства беларускай школы", "Таварыства беларускай мовы", "Новая касталія", "Зваротная сувязь", "Чазенія" ды іншыя, і мы разам пачалі ладзіць розныя адукацыйныя мерапрыемствы для педагогаў: семінары, замежныя стажыроўкі, міжнародныя канферэнцыі, ствараць настаўніцкія клубы, праводзіць педагагічныя майстэрні і інш. Мы знаёмілі настаўнікаў з рознымі сучаснымі адукацыйнымі тэхналогіямі і методыкамі, якія базуюцца на дэмакратычных каштоўнасцях, настаўнікі бачылі як і дзеля чаго працуюць грамадскія арганізацыі, набывалі грамадзянскія веды і кампетэнтнасць, што падвышала іх матывацыю да выкарыстання гэтых методык, і, нарэшце, яны бачылі прыклады актыўнай жыццёвай пазіцыі, набіраліся аднo ад аднаго аптымізму.

За 6 год існавання праграмы яе ўдзельнікамі сталі каля 2000 педагогаў, назапасілася шмат адукацыйных матэрыялаў, якія не ў стане змясціць ні адно папяровае выданне. Вось тады было вырашана стварыць сайт для настаўнікаў, каб з дапамогай сучасных тэхналогій падзяліцца досведам з усімі зацікаўленымі ў паляпшэнні адукацыі і пабудовы дэмакратычнага грамадства ў Беларусі.

Некалькі месяцаў прыйшлося патраціць на пошукі ў Інтэрнеце адукацыйных рэсурсаў, якія ўжо ёсць у Беларусі

і за мяжой. Наш сайт павінен быў стаць арыгінальным, а не паўтараць інфармацыю. Як жа мы былі расчараваныя, калі ўбачылі, што ў задуманага сайта амаль няма ні канкурэнтаў, ні паплечнікаў.

Рэсурсы афіцыйных устаноў адукацыі ды міністэрства — гэта хутчэй рэкламныя старонкі гэтых устаноў, на якіх часам змяшчаюцца шматлікія інструкцыі, пастановы і г.д. — яны далёкія ад рэальных патрэбаў адукацыі і настаўніка. Метадычныя выданні зусім не маюць Інтэрнет-старонак альбо вывешваюць толькі кароткі змест выданняў, які нават не ўтрымлівае рэзюмэ артыкулаў. Адукацыйныя Інтэрнет-рэсурсы прадстаўлены рэдкімі аўтарскімі старонкамі настаўнікаў-энтузіястаў, дзе яны змяшчаюць уласныя дыдактычныя сістэмы, апісваюць асобныя заняткі. Пры апытанні настаўнікі зазначылі, што часам карыстаюцца замежнымі адукацыйнымі сайтамі, але там мала што можна ўзяць. Акрамя моўнага бар'еру перашкаджае разыходжанне ў навучальных праграмах.

Ствараючы сайт **Nastaunik.info**, мы не імкнуліся разбураць міфы галоўнага гісторыка і педагога краіны пра адсутнасць навуковай тэрміналогіі на беларускай мове і перавагу савецкай сістэмы адукацыі. Мы проста хацелі зрабіць сайт для настаўнікаў патрэбным, сучасным, прыгожым і беларускім. Бо мы верым, што такой павінна быць і наша школа.

Для стварэння менавіта такога сайта спатрэбіліся матэрыялы лепшых беларускіх настаўнікаў, пераклады артыкулаў агульнапрызнаных лідэраў сусветнай педагогікі, таксама прыдалася мастацкая адукацыя, густ і канешне натхненне Алены Кулаевай — дзякуючы ёй і яе сябрам-дызайнерам сайт атрымаў сваё аблічча. А візіткай **Nastaunik.info** стала настаўніца Іра (чамусьці мы адразу яе так назвалі), з першага погляду бачна, што яна разумная, вясёлая, дэмакратычная, свая для вучняў і далёкая да ўнутрышкольных плётак і інтыг.

Вось такім нам бачыўся беларускі настаўнік і **Nastaunik.info.**

## Сайт — метадычная бібліятэка

**Nastaunik.info** першапачаткова задумваўся як сайт-бібліятэка. Ітэрфейс дазваляў спампаваць настаўніку любы матэрыял, а таксама пакласці "на палічку" ўласную распрацоўку. Матэрыялы павінны былі адпавядаць беларускім умовам і быць максімальна практычнымі. Гэта значыць, матэрыялы, якія можна выкарыстоўваць на занятках і ў пазашкольнай рабоце з мінімальнай адаптацыяй ці без яе. Акцэнт быў зроблены на метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, распрацоўкі аўтарскіх урокаў у стратэгіі актыўнага навучання, адукацыйныя ініцыятывы і г.д. — усё, што можа дапамагчы настаўніку ўплываць на фармаванне дэмакратычнага светапогляду вучняў, кампетэнтнасцей, каштоўнасцей. Матэрыялаў праграмы назапасілася столькі, што напрацягу першага паўгода мы займаліся толькі пераводам іх у электронны фармат і напаўненнем сайта.

Матэрыялы сайта паказваюць альтэрнатыву аўтарытарным метадам навучання і "дзяржаўнай ідэалогіі". Раздзелы "Грамадзянская адукацыя" і "Нацыянальная школа" запатрабавалі стварэння новых тэкстаў, каб дапамагчы настаўнікам вярнуць першапачатковы сэнс паняццям "дэмакратыя", "грамадзянская адукацыя" і "патрыятызм".

Цяпер электронная бібліятэка метадычных матэрыялаў папаўняецца за кошт аўтарскіх распрацовак, якія прысылаюць наведвальнікі сайта (настаўнікі). Напрыклад, толькі за 3 апошнія месяцы было размешчана 114 новых артыкулаў, з іх 24 — гэта аўтарскія метадычныя распрацоўкі, дасланыя настаўнікамі, прычым сярод іх 4 кнігі (падручнікі), напісаныя лепшымі беларускімі педагогамі.

Каб наша бібліятэка мела наведвальнікаў, матэрыялы павінны быць не толькі патрэбнымі, а яшчэ даступнымі. Гэта значыць, файлы павінны быць невялікімі, праграмы для карысання — стандартнымі. Настаўнікі — яны ж у асноўным толькі вучацца карыстацца камп'ютэрам. Галоўнае іх прыцягнуць, а не адштурхнуць. Электронную адукаванасць настаўнікаў трэба падвышаць паступова.

## Сайт — электронная газета

Усе мы адчуваем, як хутка скарачаецца інфармацыйнае поле для незалежнай прэсы. Скарачаецца яно і для педагагічных інавацый, дэмакратычнай адукацыі, нефармальных адукацыйных праграм. І наш сайт узяў на сябе функцыю інфармавання настаўнікаў пра актуальныя падзеі і навіны адукацыі: Так на сайце з'явілася стужка адукацыйных навінаў.

Праз год свайго існавання сайт паступова пераўтварыўся ў своеасаблівую "Настаўніцкую газету", дзе настаўнікі могуць знайсці інфармацыю аб рэальным становішчы ў адукацыі і ў краіне, аб шляхах дэмакратызацыі школы, аб магчымасцях далучыцца да разнастайных недзяржаўных праграм. Мы стараемся адшукаць інфармацыю практычна пра ўсе конкурсы для настаўнікаў ці вучняў, стажыроўкі, стыпендыі, школьныя абмены, тэматычныя Інтэрнет-праекты. Паказаць, што настаўнік можа дасягнуць карысці дзякуючы сваёй ініцыятыве, а не толькі дзякуючы паслухмянасці і выкананню загадаў зверху.

Зразумела, новая інфармацыйная функцыя сайта запатрабавала прафесійнай журналісцкай працы і людскіх рэсурсаў. Стала неабходным весці маніторынг дзяржаўных і недзяржаўных СМІ, адсочваць змены заканадаўства і нарматыўнай базы ў галіне адукацыі, навіны дзяржаўных і замежных адукацыйных Інтэрнет-рэсурсаў. На аснове маніторынгу ствараецца агляд навінаў адукацыі. На найбольш значныя падзеі рэдакцыя сайта рыхтуе арыгінальныя каментары, праводзіць апытанні адмыслоўцаў адукацыі, вучняў і бацькоў, праводзіць параўнальны аналіз з замежным досведам у той або іншай адукацыйнай сферы. Усё часцей да нас звяртаюцца розныя арганізацыі з просьбай аказаць інфармацыйную падтрымку сваіх мерапрыемстваў.

У гэты час для працы над сайтам да каманды далучыліся настаўнікі з розных куткоў Беларусі — нашы доабраахвотныя карэспандэнты. Шмат каго мы не бачылі ў твар, але шчыра ўдзячныя за дапамогу і актуальную інфармацыю. Гэта Сяргей Сіві — настаўнік з Валожына, які вядзе рубрыку **Школьныя святы.** Ён стварае сам, а таксама збірае сцэнары школьных святаў з усёй Беларусі, апрацоўвае іх, падбірае музыку для суправаджэння, пераводзіць музычныя файлы ў зручны фармат. Дасылаюць адукацыйныя навіны для сайта Тэльман Маслюкоў са Светлагорска, Іван Храпавіцкі з Глыбокага, Лера Сом з Полацка. Далучыліся да каманды **Nastaunik.info** і студэнты-валанцёры. Сярод іх будучыя педагогі, якія добра валодаюць замежнымі мовамі і рыхтуюць матэрыялы для сайта, праграмісты, якія ўдасканальваюць праграму пад патрэбы: дапамагаюць стварыць форум, рассылку, новыя раздзелы.

Калі казаць, што ў Беларусі няма грамадзянскай супольнасці, то наш сайт, які добраахвотна робіцца педагогамі для педагогаў — таму абвяржэнне.

У настаўнікаў ёсць магчымасць падпісацца на штотыднёвую рассылку адукацыйных навінаў.

→

Рассылка мае выгляд электроннай міні-газеты. Яна мае 4 рубрыкі: "Агляд адукацыйных навінаў", "Педагагічная майстэрня", "Конкурсы, праграмы, аб'явы" і "Рознае", распаўсюджваецца ў канцы тыдня, калі ў настаўнiкаў больш часу, каб зазірнуць у Інтэрнет.

Пасля таго як з метадычнага партала **Nastaunik.info** ператварыўся ў інфармацыйна-метадычны, колькасць наведвальнікаў значна вырасла. Як толькі колькасць наведвальнікаў перавысіла 100 чалавек у дзень, стала мэтазгодным стварыць RSS-рассылку адукацыйных навінаў, якая працуе з траўня 2007 г. А паралельна нашы карыстальнікі асвоілі яшчэ адну інфармацыйную кампетэнтнасць: RSS дазваляе эканоміць і час, і трафік, якога заўсёды не хапае педагогам.

## Сайт — віртуальная пляцоўка для зносінаў прафесіяналаў

Сталыя наведвальнікі і аўтары артыкулаў, размешчаных на сайце, — гэта педагогі, якія зрабілі стаўку на гарызантальную, а не на вертыкальную кар'еру. Гэта значыць, сайт працуе для педагогаў, якія ставілі перад сабой мэту прафесійнага росту, а не пасоўвання па лесвіцы адукацыйных чыноўнікаў. Многія з гэтых педагогаў ужо дасягнулі сваёй кар'ернай столі, бо вышэй за званне, напрыклад, "Лепшы матэматык горада", расці няма куды.

Для такіх прафесіяналаў сайт **Nastaunik.info** — месца для далейшага росту. Ён дапамагае наладзіць зносіны, дае магчымасць стаць вядомым сярод такіх жа прафесіяналаў.

Сайт паступова становіцца віртуальнай пляцоўкай для зносінаў паміж педагогамі, месцам арганізацыі ўзаемадапамогі, абмену распрацоўкамі і ідэямі, інфармацыяй. Ён дае настаўнікам магчымасць самарэалізацыі, прызнання калегамі.

Па просьбе настаўнікаў нам прыйшлося распрацаваць форум для інтэрактыўных зносінаў настаўнікаў, які можна знайсці па ссылцы <u>http://nastaunik.info/forum</u>.

Пра функцыю прафесійнага "Дыскус-клуба" сайта **Nastaunik.info** пры яго стварэнні мы не маглі і марыць, але вельмі задаволеныя, што ён пачаў яе выконваць.

Мы не праводзілі адмысловай рэкламы сайта, але зваротная сувязь пастаянна павялічваецца. Апроч традыцыйнай зваротнай сувязі ад настаўнікаў, мы сталі атрымліваць лісты ад устаноў адукацыі, грамадскіх арганізацый, замежных і беларускіх партнёраў з прапановамі супрацоўніцтва.

У выніку такога супрацоўніцтва інфармацыя пра сайт **Nastaunik.info** з'явілася ў афіцыйнай "Настаўніцкай газеце", газеце "Звязда" (наклад 35 тыс.), БЕЛАПАН и недзяржаўных выданнях.

Колькасць карыстальнікаў сайта паступова расце. За адзін навучальны год колькасць наведванняў сайта ў дзень вырасла з 61 (у верасні 2006 г.) да 140 (у верасні 2007 г) і працягвае павялічвацца. Кожны карыстальнік у сярэднім адчыняе 4,35 старонкі. Расце і зваротняя сувязь.

Як ужо казалася вышэй, у Беларусі існуе абмежаваная колькасць адукацыйных Інтэрнет-рэсурсаў, таму наш сайт рэкламуюць і рэкамендуюць настаўнікам афіцыйныя інстытуты падвышэння кваліфікацыі настаўнікаў. Сайт стаў даволі папулярным. Зараз мы маем актыўную перапіску з настаўнікамі, якія дасылаюць свае матэрыялы, просяць парады калегаў, прысылаюць свае заўвагі і прапановы па ўдасканаленні працы сайта.

## Высновы

Разумеем ролю педагога ў фармаванні будучыні не толькі мы — адукацыйныя НДА — але і ўлады. Яны таксама пачалі разглядаць педагога як фактар, які ўплывае на маладое пакаленне, фактар, які можа ўмацаваць сённяшнюю сістэму. З аднаго боку, улады максімальна абмяжоўваюць свабоду настаўнікаў з дапамогай кантролю, забаронаў, кантрактаў і г. д. З іншага боку, яны істотна "падкармліваюць" паслухмяных настаўнікаў. Большасць настаўнікаў маюць дадатковы прыбытак у сферы ценявога бізнэсу — рэпетытарства. На гэтую нелегальную дзейнасць настаўнікаў улады наўмысна заплюшчваюць вочы, бо настаўнікі застаюцца сацыяльнай групай, якая масава выкарыстоўваецца імі ў механізме фальсіфікацыі выбараў.

Улічваючы тое, што беларуская дзяржава манапалізавала адукацыйную дзейнасць, і любую некантраляваную актыўнасць расцэньвае як іншадумства, якое пагражае стратай працы і іншымі рэпрэсіямі, сайт як адукацыйная пляцоўка можа быць выкарыстаны ў мэтах грамадзянскай адукацыі.

Зразумела, віртуальныя зносіны ніколі не заменяць рэальных. Дыстанцыйныя метады працы не заўсёды даюць такія ж вынікі, як, напрыклад, навучальныя семінары, дзе беспасярэднія кантакты з калегамі і трэнерамі ствараюць непаўторную атмасферу еднасці і жаданне нешта зрабіць самастойна. Але стварэнне сайта і арганізацыя дыялогу можа дапамагчы даносіць грамадзянскія веды да мэтавай аўдыторыі, знаходзіць новых людзей, заангажоўваць іх у розныя адукацыйныя праграмы, забяспечваць інфармацыяй і прыцягваць іх да іншай грамадскай дзейнасці.

**Тамара Мацкевіч**

## кніжная палічка

**Выбери жизнь. Методическое пособие по профилактике ВИЧ/СПИД среди молодежи / О.А. Кисель. — Минск, 2007. — 49 с.**




Методическое пособие издано общественным объединением "Фокус-группа" в рамках проекта "Мода на здоровье" при поддержке Представительства Христианского детского фонда в Республике Беларусь. Пособие адресовано социальным педагогам и психологам учреждений, обеспечивающих общее среднее образование и, в первую очередь, школ-интернатов для детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей. Издание будет полезно всем тем, кто работает в сфере профилактики ВИЧ/СПИД среди подростков и молодежи в учреждениях образования. Методическое пособие содержит теоретический блок по теме "ВИЧ/СПИД", теоретический блок по теме "Организация информационного занятия", сценарий интерактивного занятия по профилактике ВИЧ/СПИД. В приложении размещены иллюстрации, тексты и др.

В печатном виде пособие можно получить, обратившись к ОО "Фокус-группа" (focus_group@mail.ru), или скачать на Интернет-ресурсе для молодых сирот, сотрудников интернатных учреждений и приемных родителей: **<u>www.belinternat.org</u>**.